**22.** Якія словы з прапанаваных маюць нулявы канчатак?

*1) бегчы; 2) чытаў; 3) вятрак; 4) наперад.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**23.** Іван запісаў пад дыктоўку сказ: *Кожны, хто ходзіць па зямле, мае сваі абавяскі у жыцці.* Колькі памылак зрабіў хлопчык?

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**24.** Дадзены сказы:

*1. І пабег паляўнічы ад ваўка **(без)аглядкі**.*

*2. Спачываюць **(у)зімку** мядзведзі ў сваіх бярлогах.*

*3. Па сцяжынцы вандроўнікі выйшлі з вёскі **(у)бок** ракі.*

У якім сказе выдзеленае слова напішаце разам?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**25.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***е***?

*1) п..люля; 2) п..даль; 3) г..ктар.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**26.** Які знак прыпынку неабходна паставіць на месцы пропуску ў вершаваных радках І. Муравейкі?

*Не праганяйце кошак і сабак,*
*Калі яны прыйшлі да вас у госці.*
*Яны ў кожнай хаце _ добры знак,*
*Яны прыносяць радаснае штосьці.*

**А)** знак прыпынку не трэба ставіць.

**Б)** кропку. **В)** коску. **Г)** працяжнік. **Д)** двукроп'е.

---

**27.** *Месца, дзе пілуюць, колюць і захоўваюць, каб не моклі, былі заўсёды сухія, дровы,* называецца … .

**А)** абозня. **Б)** сцёбка. **В)** гумно. **Г)** дрывотня. **Д)** стайня.

---

**28.** Закончыце выраз.

*Субстанцывацыя – гэта пераход іншых часін мовы ў … .*

**А)** назоўнікі. **Б)** прыметнікі. **В)** займеннікі.
**Г)** прыслоўі. **Д)** дзеясловы.

---

**29.** *Інфармацыйная гутарка для журналістаў* называецца … .

**А)** інтэрв'ю. **Б)** дыспут. **В)** брыфінг. **Г)** дыялог. **Д)** дыскусія.

---

**30.** Якому элементу слова грэчаскай мовы адпавядае значэнне *'кніга'*?

**А)** monos. **Б)** biblion. **В)** chromos. **Г)** poly. **Д)** pseudos.

---


КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 3. Тыраж 21700 экз. 2021 г.


Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2021»

*Чацвер, 18 лютага 2021 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Жвавывожыкжыважукупашыўкажух.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

---

**2.** Які займеннік напішаце на месцы пропуску ў народным выслоўі *галава прыгожая не тым, што на ёй, а тым, што ў …*?

**А)** ей. **Б)** ёй. **В)** ней. **Г)** яе. **Д)** неё.

---

**3.** *Спартсмен, які займаецца парусным спортам*, – гэта … .

**А)** боцман. **Б)** мантажнік. **В)** бортправаднік. **Г)** марак. **Д)** яхтсмен.

---

**4.** Дадзены ўстойлівыя выразы: *1) усе дарогі …; 2) за дрэвамі …; 3) без руля …; 4) трымаць вуха …* . Прадоўжыце выразы, выбраўшы правільныя варыянты:

*а) без ветрыл; б) вядуць у Рым; в) востра; г) не бачыць лесу.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в.

---

**5.** Выберыце правільна ўтворанае словазлучэнне.

*1) хадзіць па сцежкам; 2) ехаць на млын; 3) спазніліся праз цябе.*

**А)** усе. **Б)** няма такіх. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**6.** У маўленні часта выкарыстоўваем дзеясловы *дзякаваць, аддзячыць, выбачаць*. У форме якога склону неабходна выкарыстоўваць назоўнікі ці займеннікі з дадзенымі дзеясловамі?

**А)** назоўнага склону. **Б)** роднага склону. **В)** давальнага склону.
**Г)** вінавальнага склону. **Д)** творнага склону.

---

**7.** Дадзены перыфразы: *1) зялёны кантынент; 2) лядовы кантынент; 3) стары кантынент.* Падбярыце адпаведнікі:

*а) Антарктыда; б) Еўропа; в) Аўстралія.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-а, 3-б. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

---

**8.** Вызначце правільна напісанае слова.

*1) рашчараванне; 2) бязколерны; 3) атказнасць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**9.** Дадзены сказ:

*У маўклівай соннай дрымоце стаяць <u>(не)рухома</u> хвоі, між якіх <u>(сям)там</u> відаць <u>(цёмна)зялёныя</u> елкі.*

Выберыце правільны варыянт напісання падкрэсленых слоў.

**А)** не рухома, сям-там, цёмна-зялёныя.
**Б)** нерухома, сям там, цёмна-зялёныя.
**В)** нерухома, сямтам, цёмна зялёныя.
**Г)** нерухома, сям-там, цёмна-зялёныя.
**Д)** не рухома, сям-там, цёмназялёныя.

---

**10.** У якіх сказах неабходна на месцы пропуску паставіць коску?

*1. Скошаная раніцай_ трава ўжо добра падвяла на сонцы.*
*2. На полі зямлю прабіла рунь_ абуджаная веснавым дажджом.*
*3. Здзіўленая_ яна вырашыла адразу ж разабрацца ў гэтай сітуацыі.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**11.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

***<u>Добра</u>*** *ўлетку ў пушчы.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**12.** У якім сказе з прапанаваных на месцы пропуску неабходна паставіць коску?

*1. Усе_ апрача нас_ запісаліся на конкурс.*
*2. Усё ж такі хадзіў тут нехта і_ акрамя нас.*
*3. Брат_ замест сястры_ навёў парадак у пакоі.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

**13.** Выберыце толькі часціцы.

*1) ды; 2) каб; 3) аж; 4) ці.*

**А)** усе часціцы. **Б)** няма часціц. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**14.** Янка атрымаў заданне напісаць словы ў гукавой транскрыпцыі. Якія з іх ён напісаў правільна?

*1) [шшытак]; 2) [п'эравосчык]; 3) [гарацк'і]; 4) [п'ерап'ішчык]; 5) [шлэйф].*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**15.** Вызначце від дадзенага аднасастаўнага сказа.

*Паўночную частку Беларусі нездарма называюць краем блакітных азёр.*

**А)** пэўна-асабовы сказ. **Б)** няпэўна-асабовы сказ.
**В)** абагульнена-асабовы сказ. **Г)** безасабовы сказ.
**Д)** назыўны сказ.

---

**16.** У якіх сказах на месцы пропуску працяжнік не ставіцца?

*1. Айсбергі _ гэта алмазы палярнага ззяння.*
*2. А заяц раптам _ гоп направа!*
*3. Фатаграфія _ таксама мастацтва.*
*4. Праўда _ не скварка, з кашаю не з'ясі.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**17.** Дадзены сказ: *Неба* ***ўсеяна*** *яркімі зоркамі.* Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова?

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем.
**Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

---

**18.** Якія словы з прапанаваных маюць марфалагічнае падваенне зычных?

*1) аконны; 2) раменны; 3) бетонны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**19.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) кліянтура; 2) ажыятаж; 3) карыяс; 4) геніяльны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**20.** Дадзены народныя выслоўі: *1) добра таго вучыць, хто ўсё хоча …; 2) вышэй пят не …; 3) за вялікім пагонішся – малое … .* Пастаўце на патрэбныя месцы дзеясловы: *а) падскочыш; б) згубіш; в) ведаць.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**21.** Выберыце прыметнікі, якія не ўтвараюць ступені параўнання.

*1) вішнёвы; 2) сінявокі; 3) вясёлы; 4) белы.*

**А)** усе. **Б)** няма такіх прыметнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.